# КРЫНІЦА ВЕДАЎ

10 снежня бягучага года адной са старэйшых навуковых бібліятэк рэспублікі — Урадавай бібліятэцы Беларусі спаўняецца 60 гадоў з дня заснавання.

Створаная ў 1933 годзе спачатку на базе філіяла Дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна, яна ў далейшым стала самастойнай бібліятэкай па абслугоўванню работнікаў дзяржаўнага апарата, грамадскіх органаў і спецыялістаў народнай гаспадаркі рэспублікі.

Сёння яна з'яўляецца буйным навуковым і культурным даведачна-інфармацыйным цэнтрам, яе фонд перавышае звыш 1,5 млн. паасобнікаў — кніг, часопісаў, газет, нот, эстампаў, патэнтаў, карт і іншых друкаваных выданняў.

Асаблівую каштоўнасць уяўляе фонд старадрукаў і рэдкіх выданняў.

У фондзе гэтай нацыянальнай скарбніцы вылучаюцца калекцыі беларусістыкі (18—20 стагоддзі), старадрукаў (16—18 стагоддзі), кніг рускага грамадзянскага друку (1725—1825 гг.), нелегальнага і забароненага цэнзурай друку 19 стагоддзя.

Штогод ва Урадавую бібліятэку паступае каля 30 тысяч новых экземпляраў літаратуры, у тым ліку кнігі і перыядычныя выданні на беларускай, рускай і замежных мовах.